

Грамадска-палітычная газета для жыхароў Бялыніцкага, Круглянскага і Шклоўскага раёнаў

Рэгіён

ВЕРАСЕНЬ 2013 **№ 8 (40)**

ПОСАДЯТ ЛИ ВАЛЕРИЯ ИВАНОВА?



Основной темой для обсуждения в СМИ на протяжении последних недель стал арест в нашей стране генерального директора «Уралкалия» Владимира Баумгертнера, который по совместительству являлся ещё и председателем наблюдательного совета ЗАО «Белорусская калийная кампания».

Между тем, ни для кого не является секретом, что вплоть до последнего времени генеральным директором БКК работал наш земляк, депутат Совета республики НС РБ от нашего региона, Валерий Иванов. Именно Валерий Иванов являлся руководителем БКК, без подписи которого не имела законной силы не одна важная сделка, заключённая кампанией.

Интернет-газета «Солидарность» в статье задаёт вопрос, что ждёт Валерия Иванова, который совсем недавно был передвинут с должности генерального директора БКК на должность заместителя руководителя администрации президента.

Ведь если в деятельности БКК были такие грубейшие нарушения и злоупотребления, то отвечать за них, в первую очередь, должен именно генеральный директор, пишет «Солидарность».

Безусловно, судьба Валерия Иванова, который на протяжении многих лет тесно связан с нашим регионом, небезразлична читателям нашей газеты, поэтому мы полностью перепечатываем размещённую в интернет-газете «Солидарность» статью журналистки Анны Снежкиной.

Следственный комитет заявляет, что есть основания для возбуждения уголовного дела не только в отношении Сулеймана

(Окончание на стр. 2)

БЯЛЫНІЦКІ РАЁН ЗАСТАЎСЯ БЕЗ КАЛГАСНЫХ СВІНЕЙ

А ўсяго ў нашай краіне 13 раёнаў засталіся цалкам без свіней у дзяржаўных і калектыўных сельгаспрадпрыемствах.

Ад пачатку года пагалоўе свіней у калгасах скарацілася на 84 тысячы галоваў.

Па стане на пачатак жніўня ў калгасах Беларусі засталося крыху больш за 3 мільёны 200 тысяч свіней.

Як паведамляе nn.by, зусім не засталося “дзяржаўных” свіней у наступных раёнах: Ганцавіцкі, Жабінкаўскі, Маларыцкі, Віцебскі, Сенненскі, Брагінскі, Кармянскі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Кастрычніцкі, Хойніцкі, Бялыніцкі, Крычаўскі.

На Івацэвіччыне яшчэ лічацца жывымі ўсяго 15 свінняў.

У пералічаным спісе шмат рэгіёнаў, дзе былі знойдзеныя праявы афрыканскай чумы. Напрыклад, у калгасах Віцебскага і Сенненскага раёнаў яшчэ год таму было амаль 50 тысяч свіней. Усіх іх давялося забіць.

Так што зараз у Бялыніцкім раёне свінні засталіся толькі ў асабістых падсобных гаспадарках насельніцтва і ў аднага з бялыніцкіх прадпрымальнікаў, на ферме якога ўтрымліваецца больш за 200 галоў свіней.

Вікторыя Бялова

ПОСАДЯТ ЛИ ВАЛЕРИЯ ИВАНОВА?

(Оконч. Начало на стр. 1)

Керимова, но и граждан Беларуси.

Белорусская сторона ответила на ход Москвы "Транснефтью" и "Роспотребнадзором". В ответ на сокращение поставок нефти в нашу страну и намёк на возможные проблемы для экспорта белорусских молочных продуктов в Россию Следственный комитет заявил, что собирается возбудить уголовное дело в отношении Сулеймана Керимова.

Впрочем, самым интригующим является утверждение представителя СК об имеющихся основаниях для уголовного преследования "также иных лиц, в том числе и из числа граждан Республики Беларусь". Кому грозит перспектива составить компанию гендиректору "Уралкалия" Владиславу Баумгертнеру, находящемуся в СИЗО КГБ, гадать не будем. Просто обратим внимание на одно обстоятельство, до сих пор находившееся на периферии скандала.

26 августа Следственным комитетом было озвучено, что "сценарий того, что произошло сейчас, был разработан фигурантами дела еще в 2011-м".

В этой связи стоит напомнить, что с марта 2012 года по конец июля 2013-го Белорусской калийной компанией руководил ставленник Александра Лукашенко – Валерий Иванов.

Роли Баумгертнера и Иванова в БКК на следующий день после ареста первого четко расписал председатель совета директоров "Уралкалия" Александр Волошин. Он заявил, что "наблюдательный совет Белорусской калийной компании, который возглавляет Баумгертнер, является надзорным органом, собирающимся лишь несколько раз в год. Председатель наблюдательного совета не имеет абсолютно никаких служебных полномочий, которыми он мог бы злоупотребить".



Валерий Иванов

"Реальным руководителем компании является генеральный директор, который всегда номинировался белорусской стороной", — отметил Волошин, и напомнил, что "несколько недель назад генеральный директор БКК был назначен на одну из высших должностей в Беларуси, а именно на должность заместителя главы администрации президента страны", что "означает, что результаты деятельности этой компании и состояние дел в ней весьма высоко оцениваются высшим руководством Беларуси".

"В данной связи, обвинения в должностных преступлениях в адрес Баумгертнера выглядят просто нелепо", — подчеркнул Волошин.

Примечательно, что до Валерия Иванова Белорусской калийной компанией в должности генерального директора руководил Владимир Николаенко — с 2005 по 2012 год. Ни открытых "калийных войн", ни арестов со всеми вытекающими последствиями при нем не было.

Тем не менее, накануне печатный орган президентской администрации обвинил Николаенко в сговоре с российской стороной. В частности, в "журналистском расследовании" под подзаголовком "В бой идут одни жулики", было написано следующее:

"С приходом в "БКК" команды Керимова обстановка в совместном российско-белорусском предприятии резко накалилась. Российские менеджеры, прежде всего Баумгертнер и Петров, сумели подмять, в том числе через высокие оклады и множество бонусов, гендиректора Николаенко, воспользовавшись его безволием и пр., сумели, по сути дела, разработать свои правила игры. Балом стал руководить Петров".

Но почему же Иванов молчал о "закулисных играх"? Тоже был "подмят" под русских "через высокие оклады и множество бонусов"? Или же "фигуранты" держали его в "заложниках" и не подпускали к отчетам и компьютерам? (Если так, почему он не докладывал об этом Лукашенко?). Или же Валерий Иванов был попросту недостаточно компетентен для кресла гендиректора Белорусской калийной компании, раз проглядел "антимировой калийный заговор"?

В любом случае, вызывает недоумение, почему, учитывая все вышеперечисленное, Баумгертнер сидит в "американке", а Иванов — в кресле заместителя главы администрации президента.

Анна Снежкина, "Салідарнасць"

КОГДА ОЧКОВТИРАТЕЛЬСТВО – НОРМА ЖИЗНИ

За приписки в «битве за урожай» восемь должностных лиц сельхозорганизаций Могилевской области привлечены к дисциплинарной ответственности.



Сергей Антонов

Искажения оперативной отчетности о ходе уборки урожая были выявлены в Быховском и Глусском районах.

Так, Быховский райсельхозпрод в представленной отчетности в конце июня завысил на 639 га не только площади убранных зерновых культур, но и приписал к их валовому сбору 2835 тонн зерна, а также увеличил объемы заготовки сена и силоса, добавив к реальным “виртуальные” 4,6 тысячи тонн и 9,4 тысячи тонн соответственно.

Быховский СПК “Следюки” завысил объем намолота зерна на 889 тонн (80% фактически убранного), а СПК “Быховский” - заготовки сена на 519 тонн (95% заготовленного).

Попытка взять «все лучшее от советского строя», обернулась для Беларуси тем, что на вооружение было взято самое худшее.

Бездельники и горлопаны, ранее именовавшимися комсомольцами, прошли процесс обновления и переименования, нисколечко не изменившись по своей, мелкоуголовной сути.

Численность чиновников командно-административной системы выросла в разы, а их действенность во столько же уменьшилась.

Слово «девальвация» белорусские дети начинают произносить раньше, чем привычные «папа» и «мама».

Вполне рутинное занятие по уборке урожая, как в старые добрые времена именуется битвой. Механизаторы, чуть ли не до крови сражаются за победу в вывозке навоза и со слезами умиления на глазах читают свои имена на экранах соцсоревнования в жатве.

Чиновники, под чьим чутким руководством никогда и ничего путного не росло, тоже не сидят без дела. Они, как мы видим, обеспечивают себе карьерный рост с помощью приписок и очковтирательства.

То, что нынешняя власть пытается объяснить сталинским термином «перегибы на местах» является неотъемлемой частью системы, созданной командой Александра Лукашенко.

Когда работа подменяется видимостью работы, а трудовая дисциплина сводится приковыванием работника к его месту цепями, искоренить приписки не удастся.

Причем не только в «битве за урожай». Очковтирательство может быть и завуалированным.

Так, например, быховские власти, готовившие город к Дню белорусской письменности, провели кампанию по пропаганде «красот» дворов и приусадебных участков жителей района.

Хвалебных од удостаивались «очумельцы», построившие у своих домов пальмы из пластиковых бутылок и прочие фантазеры, украшающие домовладения по принципу «дешево и сердито».

Одним из общественных вариантов «чуда», не требующего больших капиталовложений, станет музей камней.

Чего-чего, а этого добра в Быхове хватает: бывший председатель райисполкома, сейчас занимающий пост главы местных «депутатов», в свое время просто завалил город выкрашенными в красный цвет валунами.

На них были намалеваны поучительные цитаты великих. Хорошо запомнилась быховчанам одна из таких фраз, почему-то приписанных Горькому «Кто работает, тот не скучает».

Судя по тому, что творится в нашей стране, скучающих у нас много. Особенно среди тех, кто мнит себя руководителями.

Сергей Антонов

ГЛАВОЙ ДФР ЛУКАШЕНКО НАЗНАЧИЛ СВОЕГО ЗЕМЛЯКА

Недавно в Комитете государственного контроля состоялось представление нового руководителя Департамента финансовых расследований. Им оказался Игорь Маршалов - уроженец Шклова Могилёвской области.

В ходе назначения на должность очередного земляка Лукашенко, председатель КГК Александр Якобсон отметил, что сейчас работникам органов финансовых расследований необходимо не только пресекать правонарушения, но и выявлять причины, им способствующие.

Как отмечается на сайте КГК, новый назначенец родился 12 января 1972 года. В 1993 году окончил Вольское высшее военное училище тыла, в 1998 году – Белорусский коммерческий университет управления.

Службу начинал в ноябре 1993 года старшим инспектором отдела налоговых расследований по г. Мозырю Государственной налоговой инспекции Министерства финансов РБ.

ХТО МАЕ ВЫГОДЫ З НЕРАЗБЯРЫХІ Ў СФЕРЫ ЖКГ?

«Сегодня мы в системе жилищно-коммунального хозяйства увидели ряд серьезных проблем, которые не укладываются в директивные документы, связанные с ресурсо- и энергосбережением... Увеличения себестоимости работ в итоге ложатся на тарифы и на население», — дакладваў 25 ліпеня старшыня Камітэта дзяржкантролю А.Якабсон, згодна даручэння А.Лукашэнкі, агучанага 16 красавіка 2013 года на нарадзе па пытанню функцыянавання і развіцця беларускай энэргетыкі.



«До сих пор у меня полной ясности нет. Говорят, что населению надо возмещать 60% затрат и сегодня этого нет. А я скажу, что 70% есть! Потому что, во-первых, я не знаю истинных тарифов ЖКХ, и мне кажется, что эта себестоимость у них увеличена — факты приводили, она в два раза выше, чем могла бы быть. А если в два раза выше, то наше население сегодня платит не 30%, а 60% с лишним. Попробуйте меня опровергнуть! Вот я так посчитал», — заявіў Лукашэнка ў час красавіцкай нарады.

Немагчыма не пагадзіцца часткова з гэтымі словамі, бо, відаць, парадак фармавання тарыфаў на паслугі ЖКГ не ведае ніхто з вышэйшага чынавенства, калі на гэтае пытанне не змаглі (а можа не захацелі?) адказаць ні прадстаўнікі Міністэрства ЖКГ, ні прадстаўнікі Міністэрства энэргетыкі.

А як жа быць і да каго звяртацца з гэтымі праблемамі простаму грамадзяніну нашай краіны, калі, нават, кіраўнік дзяржавы напярэдадні падобнай нарады не валодае дакладнай інфармацыяй.

Бо крыху больш чым праз два месяцы — 28 чэрвеня 2013 года — у час прамой лініі ў газеце “Звязда” міністр ЖКГ Андрэй Шорэц прывёў зусім іншыя лічбы. Ён заявіў, што сёння насельніцтва аплочвае ўсяго толькі 16,3% затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг, што, па яго-ных словах, адпавядае 2,8% дахода сям’і з чатырох чалавек, пры двух працуючых, пражываючай у 2-пакаёвай кватэры.

Меры па пераходу на аплату насельніцтвам 100% страт на камунальныя паслугі беларускім кіраўніцтвам пачалі прымацца шмат год таму. Яшчэ пастановай Савета міністраў № 943 ад 14 ліпеня 2003 году “Аб Канцэпцыі развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь да 2015 года”, у звязку з гэтым, да этапа заканчэння рэалізацыі Канцэпцыі планавалася выканаць цэлы комплекс мераў:

- давесці долю жыллёвага фонду, абслугоўваемага на конкурснай аснове, да 100% шляхам стварэння прыватных арганізацый у большасці з формай упраўлення шматкватэрнымі жылымі дамамі — таварыствамі ўласнікаў;
- завяршыць, у асноўным, пераход ЖКГ на работу ў рэжыме безстратнага функцыянавання з улікам пераходу на поўную аплату насельніцтвам страт на ўтрыманне і рамонт жылых памяшканняў, камунальных паслугаў пры забяспячэнні адраснай сацыяльнай абароны насельніцтва;
- у мэтах пашырэння інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці ў рэалізацыі высокарэнтабельных праектаў рэканструкцыі і развіцця ЖКГ, паляпшэння работы па збору плацяжоў ад насельніцтва, забяспечыць стварэнне рэспубліканскага банка ЖКГ;
- распрацаваць і ажыццявіць механізм абавязковага страхавання жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах;
- завяршыць, у асноўным, работы па мадэрнізацыі і цеплавой рэабілітацыі буйнапанэльных жылых дамоў першых масавых серый у рамках выканання пастановы Савета міністраў РБ ад 17 студзеня 2003 г. № 45.

Ужо ў 2000-2005 гадах рост тарыфаў для насельніцтва на жыллёва-камунальныя паслугі яўна апярэджваў агульны паказчык інфляцыі. Пры росце спажывецкіх коштаў за 2000-2005 гады ў 6,1 раза, тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі, уключаючы электра- і газазабяспячэнне, павялічыліся ў 50,7 раза. Найбольш хуткімі тэмпамі раслі тарыфы на ацяпленне, тэхнічнае абслугоўванне жылфонда, электразабяспячэнне.

У выніку ўзровень пакрыцця плацяжамі насельніцтва страт на прадастаўленыя жыллёва-камунальныя паслугі, акрамя электра- і газазабяспячэння, для стандартнай двухпакаёўкі, згодна

(Працяг на стар. 5)

ХТО МАЕ ВЫГОДЫ З НЕРАЗБЯРЫХІ Ў СФЕРЫ ЖКГ?

(Працяг. Пачатак на стар. 4)

статыстычных дадзеных, узрос з 12% у 2000 годзе да 42,4% у 2005.

Разам з тым доля жыллёва-камунальных паслугаў у спажывецкіх расходах насельніцтва ўзрасла з 3% да 9,1%.

Падобнай практыкі ў сферы ЖКГ беларускія ўлады прытрымліваліся і ў наступнай пяцігодцы. Згодна пастановы Савета міністраў № 720 ад 7 чэрвеня 2006 года аб "Праграме развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь на 2006-2010 гады", прыярытэтнымі накірункамі рэфармавання і развіцця жыллёвай гаспадаркі краіны на гэтыя гады станавіліся:

- павышэнне ўзроўню пакрыцця тарыфамі страт на прадастаўленне паслуг для насельніцтва шляхам зближэння тарыфаў з сабекоштам па рэгулюемых паслугах згодна з дынамікай росту прыбыткаў насельніцтва, а таксама павелічэнне долі паслуг, аказваемых на дагаварной платнай аснове;
- дэманапалізацыя жыллёвай гаспадаркі шляхам падзялення функцый упраўлення і абслугоўвання жыллёвага фонду, стварэнне канкурэнцыі паміж арганізацыямі;
- рэфармаванне сістэмы фінансавання бягучага і капітальнага рамонту жыллёвага фонду;
- цеплавая мадэрнізацыя жыллёвага фонду.

Для забяспячэння паспяховага выканання дадзенай Праграмы, як і на разнастайныя ранейшыя, былі выдзелены фінансавыя сродкі ў памеры 12 826,2 млрд. руб.

На пачатку новай пяцігодкі — 2011-2015 гады — падобная праграма доўгі час зусім адсутнічала і была зацверджана пастановай Савета міністраў № 97 толькі 8 лютага 2013 года (2011 і 2012 гады — па факту).

З якім ж мэтамі беларускім урадам прымалася падобная праграма ажно ў сярэдзіне пяцігодкі і што прынесла гэтая пастанова № 97 грамадзянам краіны?



Усё вельмі проста. Згодна новай пастановы, ранейшая пастанова Савета міністраў № 943 ад 14 ліпеня 2003 году "Аб Канцэпцыі развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь да 2015 года"прызнана страціўшай сілу.

Па выніках пастановы № 97 выходзіць, што нягледзечы на прыгожыя рапарты аб выкананні цэлага тузіна раснастайных праграм у сферы ЖКГ, распрацаваных пад Канцэпцыю, і асваенне шматлікіх дзесяткаў трыльёнаў рублёў на іх выкананне, нягледзечы на пастаянны рост коштаў паслуг ЖКГ для насельніцтва, станоўчых зменаў у камунальнай гаспадарцы краіны не адбылося. А ўзровень пакрыцця насельніцтвам страт за аказаныя жыллёва-камунальныя паслугі ў 2010 годзе складаў 24,2%, ў 2012 годзе — 15,3%.

Гэта на колькі трэба было накруціць сабекошт камунальных паслугаў, каб у плане пакрыцця страт насельніцтвам у выніку апынуцца на ўзроўні 2000 года?

Адбываецца прыхаванае рабаўніцтва насельніцтва, як праз выстаўленне коштаў у "жыроўках" на аплату камунальных паслугаў, так і праз разнастайныя падаткі ў бюджэт, адкуль фінансавыя сродкі ідуць на пакрыццё розніцы сабекошту паслугаў, што беларускія ўлады яшчэ прыпадносяць як "благоденствіе" для народа, выконваючы пры гэтым простую функцыю неэфектыўнага распараджальніка рэсурсамі, сабранымі з грамадзян.

Для пазітыўных пераменаў у сферы ЖКГ уладам неабходна прыняць тэрміновыя меры:

- стварыць ўмовы па забяспячэнню грамадзянам краіны права выбару пастаўшчыкоў камунальных паслугаў;
- праз фонды заработнай платы, сацыяльныя фонды размеркаваць сярод насельніцтва бюджэтныя сродкі, якія накіроўваюцца прадпрыемствам ЖКГ, што дазволіць узняць узровень пакрыцця насельніцтвам страт за аказаныя жыллёва-камунальныя паслугі да 100%;
- з мэтай стварэння канкурэнцыі ў сферы ЖКГ, забяспечыць роўныя ўмовы для дзейнасці прадпрыемстваў розных формаў

(Заканчэнне на стар. 6)

24 жніўня ў Магілёве памёр вядомы беларускі журналіст, старшыня Магілёўскай абласной філіі БАЖ і проста цудоўны чалавек Генадзь Вітольдавіч Суднік. За тры дні да смерці Генадзь Вітольдавіч адзначыў свой сямідзесяцігадовы юбілей.

У знак памяці гэтага выдатнага чалавека журналісты “Рэгіёна” прапануюць чытачам пазнаёміцца з артыкулам Алеся Буракова “Суднік па-магілёўскі “, які быў надрукаваны напярэдадні сямідзесяцігадовага юбілею Генадзя Вітольдавіча Судніка ў часопісе “Абажур”.

СУДНІК ПА-МАГІЛЁЎСКУ

Неяк на пачатку 2005 года моладзь сабралася ў грамадскім цэнтры «Кола», каб сустрэць замежную дэлегацыю. І вось бачаць, як па лесвіцы на другі паверх падымаецца сівы чалавек «без узросту»: вытанчаны, у фірмовым пінжаку, добрых ботах і паплэйбойску завязаным чырвоным шаліку.

«Божухна, які мужчына!» — вырвалася ў адной з дзяўчын. «Мабыць, француз», — рэзюмавала яе сяброўка.

«Француз» нечакана загаварыў па-беларуску. Ім аказаўся маёр запасу, выпускнік Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК КПСС у Маскве, былы інструктар ЦК КПБ Генадзь Вітольдавіч Суднік. Сыну вайскоўца, што нарадзіўся ў штабным горадзе Паўднёва-Уральскай ваеннай акругі — Чкалаве (так называлі Арэнбург з 1938 па 1957 гг.), а потым яшчэ і ажаніўся на дачцэ вайскоўца, здаецца, сам лёс наканаваў мець вайсковую выпраўку і лаяльнасць да савецкай улады з усімі яе тагачаснымі парадкамі. Аднак жыццё аказалася больш цікавым і багатым на кантрасты.

Мы кажам «партыя»…

У пачатку 1980-х, яшчэ напярэдадні перабудовы, партыя кінула яго на новы «фронт» — стварыць Магілёўскую абласную студыю тэлебачання. Ад праектна-каштарыснай дакументацыі знакамітага чырвонага будынка, што па вуліцы Першамайскай, 83 і да першага ўласнага выпуску навінаў у студзені 1989 года — усе этапы станаўлення тэлевяшчання ў Магілёве прайшлі пад «зоркай» Судніка.

Старшыня абласнога камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні запомніўся тым, што сам вычытваў усе выпускі навінаў, да якіх у яго было надта неабыякавае стаўленне. Старажылы мясцовага TV прыгадалі, як аднойчы да пачатку эфіру заставалася пара гадзін, а тэксты яшчэ былі на стале ў кіраўніка камітэта. Рэдактары пачалі нервавацца, але баяліся зайсці да шэфа. Урэшце вырашылі накіраваць да яго самага маладога супрацоўніка.

— Генадзь Вітольдавіч, час «Навіны» запускаць, — кажа маладзён.

— Навіны? А яны ёсць? — запытаўся Суднік. — Ну тады запускаем… — і шпурнуў у паветра стос папераў. Як рэагаваць на такое, тады яшчэ ніхто не ведаў. Стажор, абсыпаны «сырымі» тэкстамі, стаяў як укопаны, а так званыя рэгіянальныя навіны асядалі па ўсім кабінеце. Потым была размова, як рабіць сапраўды актуальныя, аператыўныя навіны, каб яны былі цікавыя для жыхароў рэгіёна.

«Гнілая» інтэлігенцыя

Пазней тэлевізійны начальнік прынясе шмат непрыемных, нават выпрабавальных хвілінаў тым, хто ўсё жыццё перастрахоўваўся і ціхенечка пераседжваў грамадска значныя для краіны падзеі. У Магілёве кажуць, што менавіта такія «прамудрыя пячкуры» ад журналістыкі і працуюць сёння на рэдактарскіх пасадах у розных дзяржаўных медыя.

19 жніўня 1991 г., калі танкі ўвайшлі ў Маскву, а самазваны Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ГКЧП) рыхтаваўся да прэсавай канферэнцыі, цэковец і старшыня абласнога тэлерадыёкамітэта Генадзь Суднік знаходзіўся ў адпачынку. Несумненна, беларускі жнівень ці не лепшы месяц для барбекю на беразе рэчкі. У тыя часы савецкія наменклатуршчыкі часта адпачывалі на партыйных дачах, якімі карысталіся без асаблівых маральных пакут і абмежаванняў. Сотні чыноўнікаў і партыйных босаў у дзень канстытуцыйнага перавароту адключылі тэлефоны і заляглі «на дно», каб перачакаць «смутны час». Аднак Суднік паступіў інакш. І якія лейцы падштурхнулі яго ў тыя дні для мясцовага творчага beau monde, дагэтуль застаецца таямніцай.

У памяці ветэранаў магілёўскага тэлебачання захаваліся ўсе, нават самыя дробныя, падзеі таго дня. Перадусім іх здзівіла, што Генадзь Суднік сам адклікаў сябе з адпачынку. Маўляў, навошта, «бо жыў жа ў шакаладзе».

(Працяг на стар. 7)

ХТО МАЕ ВЫГОДЫ З НЕРАЗБЯРЫХІ Ў СФЕРЫ ЖКГ?

(Заканч. Пачатак на стар. 4-5)

уласнасці;

- стварыць спрыяльныя ўмовы для дзейнасці грамадзянскіх супольнасцяў па месцы жыхарства, што паспрыяе забяспячэнню празрытасці выкарыстання сродкаў, якія выдзяляюцца на абслугоўванне і рамонт жылога фонду…

Нават выкананне ў кароткія тэрміны “Канцэпцыі развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь да 2015 года” можа забяспечыць дасягненне станоўчых перамен у ЖКГ нашай краіны.

Рыгор Кастусёў

СУДНІК ПА-МАГІЛЁЎСКУ

(Працяг. Пачатак на стар. 7)

Да ўсяго напісаў заяву з асуджэннем дзеянняў ГКЧП. І, што самае страшнае, як прыгадалі ветэраны, прымусіў супрацоўнікаў магілёўскага тэлерадыёаб'яднання падпісацца пад гэтым дакументам. Расклад быў такі: тэхнічны персанал, калі хоча, то падпісваецца, а вось творчыя работнікі — падпісваюцца абавязкова і бескампрамісна!

Столькі ненарматыўнай лексікі, што круцілася ў галовах супрацоўнікаў тэлебачання, а часам і агучвалася ў завуголлях адміністрацыйнага будынка ў дачыненні іх кіраўніка, па іх жа прызнанні, у іх жыцці ніколі не было. Палова падпісантаў, схіліўшы галаву, сышла, а многія трэсліся ў кабінетах і на поўным сур'ёзе чакалі хуткага арышту і праклінала той дзень, калі прыйшлі працаваць да Судніка. Аднак ужо 21 жніўня 1991 года, калі з Масквы прыйшла інфармацыя, што путч праваліўся, яны ганарыліся тым, што «супрацьстаялі» хунце і ахвотна распавядалі пра сваю адвагу. Генадзь Суднік у гэты дзень проста адсвяткаваў свой другі дзень нараджэння.

Падзеі 19 жніўня 1991 года сталі момантам ісціны для ўсіх, хто нарадзіўся і зрабіў кар'еру ў СССР. У гэты дзень выявіліся самыя лепшыя альбо самыя гнюсныя рысы чалавечага характару. Дзіўна, але некаторыя «сябры» Судніка дагэтуль надта нервова рэагуюць на пытанне пра свае асабістыя паводзіны ў 1991 годзе. Відаць, і сёння зайздросцяць смеласці і моцы Судніка, якія перамаглі нікчэмнасць і ліслівасць многіх «праваднікоў палітыкі партыі», як тады называлі літаральна ўсіх журналістаў. Цяпер былым калегам толькі і застаецца, што распавядаць пра «цяжкі характар» іх былога кіраўніка.

Містэр «Не»

А характар у яго і дагэтуль цвёрды. Даммы, што ведаюць Судніка як вытанчанага еўрапейца і галантнага інтэлігента, нават і не падазраюць, што часам ён западае ў такую лютасць, што яго апанентаў прыходзіцца ў літаральным сэнсе ратаваць. Такім Суднік бывае, калі дыскусія тычыцца гонару ці здрады, свабоды ці няволі, прыстасавальніцтва ці прафесійнай мужнасці. Важным і нават сакральным для яго было і застаецца пытанне нацыянальнай свядомасці і незалежнасці Беларусі.

Такая пазіцыя, безумоўна, паўплывала і на далейшы лёс Генадзя Вітольдавіча. Хто толькі не заходзіў у кабінет старшыні Камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні падчас апошніх у савецкай гісторыі выбараў у Вярхоўны Савет БССР. Кандыдаты ў дэпутаты па чарзе раіліся з ім наконт эфірнага часу. З кожным Суднік персанальна абмяркоўваў актуальныя падзеі. І неяк, кажуць, «завёўся», выказаў новаспечаным «рупліўцам» пра народнае шчасце ўсё, што думае.

Таму, калі надышоў час пераможцам тых выбараў ісці ў рэстаран, куды сабраліся ўсе «мясцовыя», тады яшчэ сціплыя і пераважна сумленныя, press-дзеячы (пазней яны ўзначаляць практычна ўсё, што можна ўзначаліць у гэтай краіне), то адбылася размова, пра якую мне таксама распавялі па «вялікім сакрэце»:

— Ці клікаць Судніка? — запытаўся адзін з рэдактараў.

— Відаць, не. Не наш чалавек, — пасля паўзы адказаў ужо абраны дэпутат, які пазней здолее стаць першым беларускім прэзідэнтам.

Натуральна, пасля гэтых слоў дні Генадзя Судніка на пасадзе кіраўніка былі падлічаныя. І зразумела, што апошнім стаў дзень інаўгурацыі новаабранага кіраўніка дзяржавы.

Думаю, для многіх будзе дзіўным даведацца, што калісьці Генадзь Суднік практычна зусім не ведаў беларускай мовы. Каб выправіць сітуацыю, ён абкладаўся слоўнікамі ў сваім начальніцкім кабінеце і бясконца вучыўся. Не дзіўна, што такія людзі сапраўды былі чужымі для аматараў «вершаў Быкава».



Генадзь Суднік

Чырвоныя кніжачкі

У сакавіку 2008 года адразу тры маёры з магілёўскай абласной управы КДБ а восьмай раніцы заявіліся на кватэру Генадзя Судніка. Намеснік пракурора

(Заканчэнне на стар. 8)

СУДНІК ПА-МАГІЛЁЎСКУ

(Закач. Пачатак на стар. 6-7)

г. Мінска А. Стук дазволіў ператрус у межах расследавання крымінальнай справы па ч. 1 арт. 367, узбуджанай у дачыненні да Андрэя Абозава, Алега Мініча і Паўла Марозава. Іх абвінавацілі ў стварэнні сатырычных фільмаў пра Аляксандра Лукашэнку. У пастанове было напісана, што следчы пракуратуры г. Мінска В. Шабан даручыў магілёўскаму КДБ «пашукаць прадметы, якія могуць знаходзіцца ў кватэры Генадзя Судніка і мець дачыненне да ўзбуджанай крымінальнай справы».

Маёры мелі асалоду стаць сведкамі цэлага шэрагу парадоксаў. Па-першае, яны ішлі ў самы цэнтр горада рабіць ператрус у доме, дзе жывуць усе мясцовыя «шышкі». Па-другое…

— УКГБ по Могилевской области, — важна прад'явіў чырвоную кніжачку першы з трох.

— Ага… так-так, у мяне таксама ёсць, амаль такая ж, — пажартаваў у адказ Суднік.

Пачаўшы гартаць невялічкі стос чырвоных кніжачак гаспадара кватэры, маёры крыху зніякавелі. Яны чулі пра розныя КПСС, Маскву і ЦК, але ж жыўцом такога пакуль яшчэ не бачылі. Таму ўключаць «агентаў 007» было зусім недарэчным, а рабіць сур'ёзныператрус — сорамна. Тым часам было відавочным, што «савецкі маёр» Суднік бачыў перад сабой не разведчыкаў, а нейкіх «пацаноў» з раёна, якія па волі лёсу апынуліся на службе ў структуры, назва якой калісьці складалася ў страшную абрэвіятуру з трох літараў — КДБ. Але гэта было калісьці…

У кватэры Судніка ёсць шмат дзіўных рэчаў. Побач з партрэтам жонкі на тле Эйфелевай вежы, напрыклад, стаіць партрэт Эмі Уайнхаўс. Прыгожая. Спачатку ўсе думаюць, што гэта дачка. Але, даведаўшыся пазней, што гэта брытанская спявачка, здзіўляюцца. Шок! Сівы Суднік, нібы зафаначаны падлетак, толькі замест постэра з часопіса трымае партрэт любімай рок-зоркі. Не менш дзіўна выглядае на фота і шчаслівы былы інструктар ЦК каля статуі Свабоды ў Нью-Ёрку.


Але найбольш парадаксальна выглядала тое, што выдатнік марксізму-ленінізму, які вучыўся на паралельным курсе з цяперашнім лідарам расійскіх камуністаў Генадзем Зюганавым, раптам стаў самым адданым абаронцам нацыянальных каштоўнасцяў Беларусі. Насупраць яго сталі тры разгубленыя спецслужбісты, чыё юнацтва выпала на ўжо вернуты бел-чырвона-белы нацыянальны сцяг. А сталенне — на знявагу гэтай гістарычнай святыні, якую вандалы парвалі на кавалкі, ды на вяртанне да савецкага ладу жыцця. Такім чынам у кватэры ў цэнтры Магілёва сутыкнуліся шчасце і мудрасць напоўніцу пражытага жыцця і разгубленасць, калі не «зашуганасць», беспрынцыповай маладосці.

Той перагрус доўжыўся больш як дзве гадзіны, але ўрэшце маладыя маёры забралі толькі сістэмны блок кампутара, каб не пайсці з пустымі рукамі. Справаздачу ж пра нешта пісаць трэба…

Ціск на абласнога каардынатара ГА «БАЖ», натуральна, выклікаў абурэнне ў мясцовых журналістаў — як незалежных, так і «дзяржаўнікаў». Бажаўцы прапаноўвалі свае камп'ютары, фотакамеры, аргтэхніку. Некаторыя нават казалі, што ў знак салідарнасці гатовыя адседзець колькі сутак адміністрацыйнага арышту, калі спатрэбіцца.

— Не-не… Экстрыму не трэба… Толькі сяброўскія складкі не забываем плаціць, — адказаў калегам Генадзь Суднік. — Жыццё ж, даражэнькія мае, працягваецца!

БЕЛЫНИЧСКИЙ УБИЙЦА



18 августа Могилевским межрайоным отделом Следственного комитета возбуждено уголовное дело по ст. 139 ч. 1 УК (Убийство) в отношении несудимого жителя г.п. Белыничи 1986 г.р., который 17 августа в 22-30 в д. Гаи Могилевского района в дачном доме жителя д. Саськово Шкловского района 1937 г.р., в ссоре после совместного распития спиртных напитков, нанес последнему удар ножом, от которого он скончался на месте пришествия. Подозреваемый задержан в порядке ст. 108 УПК, сообщает сайт УВД Могилёвского облисполкома.

ДЗЕНЬ У ГІСТОРЫІ

5 верасня 1654 года маскоўскі цар загадаў ваяводу Трубяцкому вывезці з Галоўчына ў Смаленск званы, метал, лекі і дактароў.

8 верасня 1761 года - Дзень каранацыі цудатворнага абраза Бялыніцкай Маці Божай, найбольшы фэст у Бялынічах.

1 верасня 1993 года выйшаў у свет першы нумар газеты дэмакратычных арганізацый Бялыніцкага раёна "ПАХОДНЯ".

Рэгіён

Грамадска-палітычная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Надрукавана на ўласным абсталяванні па адрасе: 213173, Магілёўская вобл., Бялыніцкі р-н, аг-к Вялікая Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Наклад 299 асобнікаў. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Падпісана ў друк 04.09.2013 г. у 11-00.